выставочных ресурсов и постоянном повышении скорости реакции цифрового искусства на изменения в обществе.

1. *Ерохин, С. В.* Цифровое компьютерное искусство / С. В. Ерохин. – СПб. : Алетейя. – 2011. – 188 с.

2. Искусство Нового времени: Опыт культурологического анализа / отв. ред. О. Л. Кривцун. – СПб. : Алетейя, 2000. – 307 с.

***С. А. Ганчарова,***
*кандыдат тэхнічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

## СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ПАДТРЫМКІ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ ПРАЕКТАЎ У ІНТЭРНЭЦЕ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўмовах віртуалізацыі вольнага часу і з’яўлення новай парадыгмы развіцця мастацтва, культуры сродкамі і формамі сацыякультурнай дзейнасці становіцца глабальная сетка Інтэрнэт. Інтэрнэт-супольнасць, сацыяльныя сеткі і ў цэлым Інтэрнэт даюць карыстальніку прастору і інструментарый для рэалізацыі сацыякультурных праектаў, магчымасць задзейнічаць інтэграцыйны і трансляцыйны патэнцыял віртуальных формаў зносін і тэхналагічны – шматлікіх тэматычных рэсурсаў і вэбсэрвісаў.

Сацыякультурны праект (СКП) адрозніваецца разнастайнасцю праектных сітуацый і праектных рашэнняў, абмежаванасцю рэсурсаў яго ажыццяўлення, варыятыўнасцю спосабаў дасягнення мэты, скіраванасцю на патрэбы і інтарэсы насельніцтва [3].

Значэнне і роля інфармацыйных тэхналогій не аднолькавыя ў розных культурных ініцыятывах. Пакінуўшы ў баку чыста інфармацыйныя праекты ад баз даных да твораў медыямастацтва, разгледзім інфармацыйны складнік сацыякультурных праектаў, сродкі і метады іх падтрымкі ў Інтэрнэце.

Інфармацыйны складнік не тоесны інфармацыйнаму суправаджэнню праектаў і не зводзіцца да праяў рознага роду PR-актыўнасці. Падрыхтоўка праекта на сучасным узроўні прадугледжвае пастаянную камп’ютарную рэфлексію [4], якую можна ажыццяўляць у вэб-прасторы.

У сацыякультурным праектаванні вэб-тэхналогіі ўжо сёння забяспечваюць:

– стварэнне прасторы праектнай камунікацыі;
– доступ да інфармацыі;
– узаемадзеянне партнёраў;
– пашырэнне базы праектавання;
– стварэнне новых рэсурсаў;
– інфармацыйнае і PR-суправаджэнне праекта і г. д.

На стадыі даследавання, ініцыявання СКП выдатным сродкам арганізацыі дзейнасці з'яўляецца стварэнне агульнадаступнага сайта альбо старонкі ці групы праекта ў сацыяльнай сетцы. Яны дапамогуць арыентавацца ў праблемным полі, сабраць і правесці рэвізію ідэй, якія існуюць у рамках пэўнага соцыуму. Для распрацоўкі канцэпцыі СКП, фармулявання асноўнай ідэі неабходна ў думках прадставіць яшчэ не існуючае як рэальнасць. Тут зручна выкарыстоўваць сэрвісы ментальных карт, падобныя да mindmeister.com, для падачы і візуалізацыі канцэпцыі – сайты інфаграфікі і прэзентацый (накшталт 5coins.ru і prezi.com), для апытання аўдыторыі – drive.google.com і інш.) [2].

Вэб-прастора прапануе магчымасці прыцягнення сродкаў – фандрайзінг. Для прыцягнення фінансавання зручна выкарыстоўваць сэрвісы краўдфандынга, напрыклад boomstarter.ru, якія выступаюць сёння як спосаб пошуку і падтрымкі аўтарскіх праектаў, арыгінальных, сацыяльна арыентаваных ідэй, карысных для грамадства, а таксама як зручны і просты спосаб прыцягнення калектыўнага фінансавання для старту праекта. Платформа Boomstarter уяўляе вялікую цікавасць для прадстаўнікоў творчых прафесій (мастакоў, акцёраў, кінарэжысёраў, музыкантаў, дызайнераў, пісьменнікаў, ілюстратараў, даследчыкаў і інш.), фарміруе супольнасць прыхільнікаў вакол праекта.

На стадыі планавання вельмі пажадана прыступіць да распрацоўкі камп'ютарнай мадэлі праекта, а таксама выбару стратэгіі прысутнасці ў Інтэрнэце. Камп'ютарная мадэль павінна адлюстроўваць істотныя бакі праектнай працы, выступаць як сродак канкрэтызацыі праектных загатовак. Дэталёвае планаванне можна ажыццяўляць з дапамогай такіх інструментаў, як сістэмы кіравання праектамі, напрыклад сэрвісу Basecamp (basecamphq.com). Яны прапануюць пабудову каляндарнага плана праекта, сродкі кіравання рэсурсамі і кантролю за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкананнем праекта, графікі Ганта і сеткавы. Гэта таксама зручнае месца для абмену файламі, правядзення абмеркаванняў, сумеснай працы над дакументамі, прызначэння задач і адсочвання бюджэту.

На стадыі рэалізацыі СКП інфармацыйная мадэль фіксуе вынікі і пацвярджае значнасць кожнага праектнага рашэння. Вядзенне праекта ў глабальнай сетцы робіць яго даступным усім удзельнікам праекта, каардынуе іх дзеянні. Ён расце ў поўным сэнсе слова на вачах у зацікаўленай часткі інтэрнэт-аўдыторыі. У будучага спажыўца ўзнікае пачуццё прыналежнасці да акту стварэння новага культурнага прадукту.

Асаблівае месца ў жыцці праекта належыць інфармацыйнай падтрымцы, рэкламе і піяру. Яны павінны суправаджаць усе фазы яго развіцця [1].

Важным у такой сітуацыі будзе не тое, чым з'яўляецца праект на самай справе, а тое, як ён прадстаўлены ў інфармацыйных сетках. Віртуальная рэалізацыя культурных ініцыятыў стала сёння ледзь ці не галоўнай спакусай, а часам і самамэтай, для многіх аўтараў праектаў.

Для канструявання навінавай інфармацыі і прасоўвання інфармацыйных нагод зручна задзейнічаць усе каналы інтэрнэт-камунікацыі і формы падачы інфармацыі: сэрвісы аўтаматызацыі публікацый RSS-стужак, кнопкі для дадання кантэнту ў сацыяльныя сеткі, сэрвісы для адначасовай загрузкі відэа на мноства відэасэрвісаў, спецыялізаваныя сайты размяшчэння прэс-рэлізаў.

Для пошукавага прасоўвання варта выкарыстоўваць доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя стратэгіі прысутнасці ў Інтэрнэце: сайты і парталы як частка іміджу, акаўнт у Твітэры, пошукавую аптымізацыю (SEO), інтэрнэт-рэкламу, мадэраванне груп і супольнасцяў, маркетынг у сацыяльных сетках (SMM), прасоўванне ў сетках праз партнёраў, анлайн-гульні, магчымасці відэасэрвісаў, вірусныя стратэгіі.

Інфармацыя, якая пастаянна паступае ад усіх удзельнікаў праекта, часам раздзеленых вялікімі адлегласцямі, збіраецца і аналізуецца менеджарам. Аналіз інфармацыі дазваляе адсочваць рух праекта, пракладваць і карэктаваць праектны курс. З мэтай кантролю і ацэнкі дзейнасці па рэалізацыі праекта падчас яго выканання неабходна ажыццяўляць маніторынг згадак аб праекце і аналіз сацыяльных медыя і online-СМІ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У гэтым дапамогуць сістэмы маніторынгу, напрыклад babkee.ru, сайты статыстыкі і аналізу паводзінаў карыстальнікаў, напрыклад Google Analytics, і інш.

Падвядзенне вынікаў. Завяршэнне – вельмі адказны момант у жыцці праекта, паколькі скончыць яго значна цяжэй, чым пачаць. Усё цікавае, творчае засталося ў мінулым, хочацца заняцца новай справай, а трэба даводзіць праект да розуму і «шліфаваць» прадстаўленне вынікаў праектнай дзейнасці ў Інтэрнэце. Аднак на выхадзе, дзякуючы вэб-рэфлексіі праекта, мы атрымліваем ужо не адзін, а два культурныя прадукты – рэальны і віртуальны.

Вэб-арыентаваная мадэль праекта характарызуецца поўнай свабодай ад якіх бы там ні было прасторава-часавых абмежаванняў і даступнасцю для ўсіх зацікаўленых удзельнікаў незалежна ад іх месцазнаходжання. Менавіта ў спалучэнні інавацыйнасці з комплекснасцю заключаецца яе галоўная перавага. І чым больш актыўна будзе адбывацца інтэграцыя сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у розныя сферы сацыякультурнай прасторы праектавання, тым больш дакладна будуць усведамляцца іх роля і значнасць.

На міжпраектным узроўні значэнне вэб-тэхналогій незвычайна ўзрастае. Яны забяспечваюць дыстанцыйны доступ да культурных рэсурсаў, дазваляюць ажыццяўляць маніторынг сацыякультурнай сітуацыі і тым самым садзейнічаюць пашырэнню сферы культурнага праектавання.

Перадавыя вэб-тэхналогіі вельмі карысныя ў паўсядзённай дзейнасці менеджара сацыякультурнай сферы, паколькі доступ да любых сусветных інфармацыйных крыніц і вэб-сэрвісаў у стане павысіць эфектыўнасць выканання ім сваіх прафесійных функцый, забяспечыць мабільнасць і якасць яго культуратворчай дзейнасці.


1. *Герасимович, А.* Интернет-сервисы на службе интернет-пиарщика [Электронный ресурс] / А. Герасимович. – 2013. – URL : http://artpr.info.

2. *Гончарова, С. А.* Использование онлайн сервисов сети Интернет в учебном процессе вуза / С. А. Гончарова // Международный конгресс по информатике: информационные системы и технологии: материалы Междунар. науч. конгресса, Республика Беларусь, г. Минск, 31 окт. – 3 нояб. 2011 г. : в 2 ч. / редкол.: С. В. Абламейко (отв. ред.) [и др.]. – Минск : [б.и.], 2011. – Ч. 1. – С. 336–339.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. для студ. спец. «Культуралогія» ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 215 с. : іл.
4. *Дукельский, В. Ю.* Культурные проекты: от замысла к реализации / В. Ю. Дукельский // Музей будущего: Информационный менеджмент / сост. А. В. Лебедев. – М. : Прогресс-Традиция, 2001. – С. 55–61.

***М. В. Лесниченко-Роговская,***
*преподаватель кафедры менеджмента СКД,*
*Белорусский государственный*
*университет культуры и искусств*

# МОДЕЛИРОВАНИЕ ПРОЦЕССА ПАТРИОТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ СТАРШЕКЛАССНИКОВ В УСЛОВИЯХ ЭКОЛОГО-ТУРИСТСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Воспитание социально-активной личности гражданина и патриота, обладающей чувством национальной гордости, гражданского достоинства, любви к Родине, своему народу, в современных условиях невозможно представить без систематической целенаправленной работы в этом направлении. Актуален поиск новых форм и способов вовлечения старшеклассников в социально-культурную деятельность, содержание которой составляет комплекс специально отработанных форм, средств и методов работы, направленных на расширение, углубление, обновление и приведение в систему знаний об обществе и природе, содействующих утверждению гражданской и нравственной позиции подрастающего поколения.

Эколого-туристская деятельность обладает существенными воспитательно-педагогическими ресурсами и особенно актуальна в среде старшеклассников, выступая одним из действенных способов формирования гражданственности, патриотизма, социальной активности.

Анализ последних педагогических исследований по проблеме воспитания гражданственности, социальной активности свидетельствует об устойчивом интересе к данной проблематике: белорусских ученых В. В. Буткевич, Л. А. Гащенко, Н. К. Катович, А. С. Лаптёнка, В. В. Чечета и др. – вопросы